* * *

3 верасня ў Арт-цэнтры Марка Ротка (Латвія, Даўгаўпілс) адкрылася персанальная выстава “IESPAIDU FRAGMENTI” дацэнта кафедры выяўленчага мастацтва М. Цыбульскага, на якой былі прадстаўлены работы мастака ў тэхніцы гуашы. Эцюды пейзажаў былі напісаны ў перыяд з 1999 года ў Германіі, Латвіі, Польшчы, Украіне і, вядома, у Беларусі. У латвійскай культурнай прасторы М. Цыбульскі вядомы як арганізатар выстаў латвійскіх мастакоў і папулярызатар латвійскага мастацтва на арт-пляцоўках Беларусі. Мастак з’яўляецца Ганаровым прафесарам Даўгаўпілскага ўніверсітэта і кавалерам Крыжа Прызнання IV ступені.

* * *

У Мінску ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага 8 верасня адкрылася выстава тэкстылю “У пошуках вольнага неба…” вядомай беларускай мастачкі Таццяны Козік, прымеркаваная да яе 60-годдзя (куратар М. Цыбульскі). Выстава ўяўляла сабой квінтэсенцыю шэрагу яркіх і пластычна-выразных праектаў, якія Т. Козік у апошнія некалькі гадоў арганізавала ў выставачных залах Беларусі.

Аснова вобразаў – асабістыя думкі, мроі, успаміны мастачкі. Вольнае паветра, палёт, птушка – ледзь не самыя распаўсюджаныя сімвалічныя вобразы ў творчасці Таццяны Козік. Неардынарнасці і арыгінальнасці створаных вобразных канструкцый шмат у чым садзейнічае ўдала знойдзеная пластычная мова. Падчас працы над сваімі кампазіцыямі мастачка ў вольных спалучэннях выкарыстоўвае розныя матэрыялы: лён, воўну, сінтэтыку, скуру, дрэва, металічную сетку. Камертонам вобразнасці ў яе творах з’яўляюцца вельмі паэтычныя, але разам з тым канцэптуальна ёмкія назвы.

* * *

Да 15-годдзя творчай суполкі м’Арт і 100-годдзя “УНОВИСа” была прымеркавана мастацкая выстава “Пранікненне ў эпоху”, адкрыццё якой адбылося 15 верасня ў Арт-цэнтры Марка Шагала ў Віцебску. Куратар дадзенай выставы і арганізатар аб’яднання м’Арт Алег Захарэвіч. Асноўная мэта аб’яднання – садзейнічаць актывізацыі культурнага жыцця і развіццю творчага дыялога мастакоў Віцебска і іншых гарадоў Беларусі. Кожны год суполка вызначае новую тэму выставы, у раскрыцці якой у сваім стылі і накірунку працуюць мастакі. Пачынаючы з 2006 года ўдзельнікамі і куратарамі асобных мастацкіх праектаў раней неаднойчы станавіліся і дацэнты кафедры выяўленчага мастацтва Сяргей Сотнікаў і Алег Кастагрыз.

* * *

Студэнткі ВДУ Марына Сцяпанава (мастацка-графічны факультэт) і Юлія Мішчанка (факультэт фізічнай культуры і спорту) сталі фіналісткамі XII Нацыянальнага конкурсу прыгажосці “Міс Беларусь”, які адбыўся 10 верасня ў Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па гульнявых відах спорту “Палац спорту”.

* * *

3 лістапада ў зале мастацка-графічнага факультэта адбылося адкрыццё выставы “Мастак і мадэль” вядомага беларускага акварэліста Аляксандра Карпана (1953–2016) (куратар М. Цыбульскі). Выпускнік мастацка-графічнага факультэта (1979) А. Карпан тры з паловай дзесяцігоддзі выкладаў на кафедры выяўленчага мастацтва (1979–2014). Адметная рыса экспазіцыі ў тым, што на ёй былі прадстаўлены малюнкі мастака з натуры (пераважна аголеная фігура), якія былі выкананы ім падчас працы са студэнтамі на занятках студэнцкага гуртка па малюнку, якім А. Карпан кіраваў. Прадстаўленыя творы вылучаюць майстэрства і віртуознасць выканання, дасканалае веданне анатоміі чалавека, глыбокае разуменне асаблівасцей і ўласцівасцей выкарыстаных графічных матэрыялаў.

* * *

Студэнтка 31-й групы мастацка-графічнага факультэта Марыя Кузьмянкова прыняла ўдзел у VIII Міжнароднай мастацкай выставе маладых мастакоў "Маладыя таленты", арганізаванай Тамбоўскай абласной карцiннай галерэяй (Расія) у сакавіку 2021 года. Журы выставы-конкурсу адзначыла творы маладой мастачкі спецыяльным дыпломам. Куратарам удзелу студэнтаў у дадзенай выставе з'яўлялася выкладчык кафедры выяўленчага мастацтва Ю. Багданава.

* * *

Старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі мастацка-графічнага факультэта ВДУ Ірына Кавалёк стала лаўрэатам I ступені Міжнароднага конкурсу-фестывалю мастацтваў "Folk Music Festival" у намінацыі "Дэкаратыўна-прыкладная творчасць / вырабы народных промыслаў". Фестываль праводзіўся ў дыстанцыйнай форме.

* * *

18 лістапада ў межах I Трыенале канцэптуальнага мастацтва "Канцэпт" (Рэспубліканская мастацкая галерэя "Палац мастацтваў") свае творы прадставіў дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва Сяргей Сотнікаў, а куратарам мастацкага праекта Таццяны Макляцовай "Existential Crisis #2019-20.?" выступіў дацэнт гэтай жа кафедры М. Цыбульскі. Выяўленчае і прыкладное мастацтва, фатаграфія, артдызайн, інсталяцыі, асамбляжы – звыш 200 беларускіх аўтараў напоўнілі прастору рэспубліканскай галерэі Беларускага саюза мастакоў эксперыментамі з формай, пластыкай, колерам і святлом.

* * *

Да стагадовага юбілею славутага прадстаўніка Віцебскай мастацкай школы, вядомага беларускага мастака Ісаака Бароўскага (18.11.1921–5.3.1991) у выдавецтве "Беларусь" у серыі "Славутыя мастакі з Беларусі" выйшла кніга, прысвечаная І. Бароўскаму (аўтар-складальнік М. Цыбульскі). Дадзеная серыя ўяўляе сабой сумесны праект выдавецтва "Беларусь" і Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь, мэтай якога з'яўляецца папулярызацыя нацыянальнай культуры, мастацтва і гісторыі, азнаямленне шырокага кола чытачоў з творчасцю мастакоў – выхадцаў з Беларусі.

* * *

1 снежня ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Д. Шчамялёва адбылося адкрыццё персанальнай выставы жывапісу і графікі "Як ёсць…" віцебскага мастака-авангардыста Аляксандра Салаўёва (1926–2021) у межах I Трыенале канцэптуальнага мастацтва "КАНЦЭПТ 2021". Праект падрыхтаваны Віцебскім цэнтрам сучаснага мастацтва сумесна з Беларускім саюзам мастакоў і мастацтвазнаўцам М. Цыбульскім.

* * *

У пачатку снежня ў выставачнай зале мастацка-графічнага факультэта адбылося адкрыццё выстаўкі Дзяржаўнай установы адукацыі "Дзіцячая школа мастацтваў № 3 г. Віцебска «Маладзік»" пад назвай "Прыбыццё. Платформа 25". Вернісаж прымеркаваны да 25-годдзя з дня заснавання навучальнай установы і з'яўляецца адным з этапаў святкавання юбілею школы. У экспазіцыі разгорнутай выставы прадстаўлены больш за пяць дзясяткаў жывапісных і графічных работ навучэнцаў мастацкай школы ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў у розных жанрах і тэхніках.